# ФАРМІІРАВАННЕ СВЕТАПОГЛЯДУ НАВУЧЭНЦАЎ ПРАЗ ТВОРЧУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ У РАМКАХ ДЫСЦЫПЛІНЫ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА (КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ)”

*Т. П. Дапіра, І. В. Наўроцкая*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

У артыкуле раскрываюцца паняцці выхавання, культуры мовы, светапогляду, творчай дзейнасці. Разглядаюцца асаблівасці фарміравання светапогляду навучэнцаў праз творчасць у рамках дысцыпліны “Беларуская мова. Культура маўлення”, у тым ліку на прыкладзе правядзення агульнаўніверсітэцкага творчага конкурсу.

Выхаванне – мэтанакіраваны працэс фарміравання духоўна-маральнай і эмацыйна каштоўнаснай сферы асобы навучэнца. Адукацыя – навучанне і выхаванне ў інтарэсах асобы, грамадства і дзяржавы, накіраваныя на засваенне ведаў, уменняў, навыкаў, фарміраванне гарманічнай, рознабакова развітай асобы [1]. Культура мовы – валоданне нормамі вуснай і пісьмовай формаў літаратурнай мовы, а таксама ўменне выкарыстоўваць выразныя магчымасці мовы ў адпаведнасці з мэтамі выказвання, камунікатыўнай мэтазгоднасцю, з умовамі зносін. Культура мовы можа быць дасягнута толькі на аснове агульнай культуры суб'екта і навакольных яго людзей, любові і павагі да роднай мовы і гісторыі нацыі, высокай культуры мыслення і паводзін.

Дысцыпліна “Беларуская мова (культура маўлення)”, як і іншыя прадметы гуманітарнага цыкла, спрыяе станаўленню светапогляду асобы, развіццю гістарычнай памяці, этнічнай самасвядомасці. Гэта адбываецца ў выніку мэтанакіраваных намаганняў па складанні праграмы, метадычных дапаможнікаў, сістэмнага падыходу ў рабоце выкладчыкаў і студэнтаў на практычных занятках. “Культура маўлення” дапамагае засвоіць асаблівасці функцыянавання нацыянальнай мовы, разумець яе структуру, аналізаваць элементы моўнай сістэмы, ажыццяўляць міжпрадметныя сувязі па гісторыі, культуры, літаратуры, павышаць ўзровень усведамлення сацыяльнай ролі мовы як сродку камунікацыі, у тым ліку ў прафесійнай сферы, раскрывае сувязі з мысленнем, паказвае здольнасці мовы адлюстроўваць з'явы рэальнага свету і іншае. Студэнты засвойваюць матэрыял дысцыпліны для якаснай камунікацыі на нацыянальнай мове.

Неабходна адзначыць, што светапогляд фарміруецца на аснове ўсёй сістэмы навуковых ведаў, ідэйна-палітычнага выхавання навучэнцаў; гэта сістэма абагульненых поглядаў на аб'ектыўны свет і месца чалавека ў ім, на стаўленне людзей да рэчаіснасці і да саміх сябе, а таксама абумоўленыя гэтымі поглядамі перакананні. Светапогляд – гэта вышэйшая форма абагульнення усіх ведаў і вопыту, ператварэнне гэтых ведаў у перакананні асобы [2, с.158].

З’яўляючыся асноўнай часткай духоўнай культуры, родная мова лічыцца і адным з галоўных сродкаў ідэнтыфікацыі асобы. Мова – яшчэ і канал псіхалагічнага, інтэлектуальнага развіцця чалавека, што фарміруе менталітэт, самастойнасць. Новы этап развіцця сучаснага грамадства, вышэйшай адукацыі ў прыватнасці, спрыяюць таму, што ў БДУІР прадмет “Беларуская мова. Культура маўлення” становіцца шырэйшай за проста вучэбную дысцыпліну. Навучанне роднай мове дае таксама магчымасць навучэнцу раскрыцца і творча праявіць сябе, выказаць уласныя думкі, сцвердзіць сваю індывідуальнасць і абгрунтаваць уласную пазіцыю на актуальную тэму.

“Многія лічаць, што сёння чалавецтва з’яўляецца “палоннікам” інфармацыйных тэхналогій. Камп’ютары, смартфоны і іншыя прылады прысутнічаюць амаль у кожнай сферы жыцця чалавека. Але тэхніка, на маю думку, ніколі не заменіць слова, бо яно, як і чалавек, – жывая істота. Слова ёсць частка самой асобы, менавіта праз слова адбываюцца зносіны, ствараецца грамадства. “Спачатку было Слова” – і будзе жыць яно заўсёды, пакуль жыве чалавек!” – так выказаўся Клімовіч Аляксей, студэнт групы 073902, ІЭФ у сваім эсэ наконт важнасці мовы і слова ў прыватнасці.

Творчая дзейнасць вучняў на занятках па мове – сукупнасць разнастайных відаў работ, у якіх праяўляецца самастойнасць мыслення, дзе навучэнцы ствараюць новыя арыгінальныя тэксты, актыўна

складаюць вусныя і пісьмовыя нарысы, артыкулы, паведамленні і інш. па выніках уласных назіранняў, даследаванняў. У творчых работах адлюстроўваюцца пачуцці, погляды, жыццёвая пазіцыя асобы.

Творчыя работы ў межах дысцыпліны “Беларуская мова (культура маўлення)” выступаюць моцным выхаваўчым сродкам. Да іх ліку адносяцца сачыненні, эсэ, стварэнне відэаролікаў, матыватараў, а таксама розныя імправізацыі, нават выразнае чытанне ўслых. Безумоўна, вышэйшай формай творчасці навучэнцаў з’яўляюцца іх першыя літаратурныя спробы: проза, вершы, артыкулы ў газетах і часопісах, напрыклад у газеце “Імпульс”, якая выпускаецца ў БДУІР.

Дзякуючы магчымасцям праявіць сябе, выказаць уласныя думкі, заняць пэўную пазіцыю пры разглядзе той ці іншай праблемы, якія прапануюцца студэнтам на занятках, фарміруюцца сур’ёзнае, удумлівае і разам з тым прыязнае стаўленне да няпрофільнага, аднак вельмі важнага для сацыякультурнай адукацыі прадмета. У межах дысцыпліны павышаецца агульная культура асобы, выхоўваецца моўны густ, дапытлівасць, працавітасць, самастойнасць. Усё гэта дазваляе выкладчыку і самому расці ў сучасных прафесійных кампетэнцыях.

З 2018 г. арганізатарам агульнаўніверсітэцкага творчага конкурсу з’яўляецца кафедра агульнаадукацыйных дысцыплін, якой аказвае падтрымку падарункамі ППА студэнтаў і ПА ГА «БРСМ» . Адказныя за конкурс выкладчыкі кафедры Дапіра Т.П., Наўроцкая І.В. Мэты конкурсу - развіццё творчых здольнасцей моладзі, выяўленне адораных студэнтаў, полікультурнае, эстэтычнае выхаванне, пашырэнне кругагляду па пытаннях маральнасці ў сучасным свеце.

Штогод у конкурсе творчых работ удзельнічаюць студэнты І курса ўсіх факультэтаў БДУІР, якія вывучаюць дысцыпліну “Беларуская мова (культура маўлення)”. У 2020 – 2021 навучальным годзе конкурсная работа прадстаўляла сабой празаічнае эсэ на тэму “А слова – сапраўды жывая рэч!” (Л.Геніюш). Летась жа студэнты рыхтавалі творчыя работы (празаічнае эсэ, апавяданне ці паэтычны твор) на адну з прапанаваных тэм:

1. Мы з вамі дзеці адной гісторыі (У. Караткевіч);
2. Вядзі рашучы бой з натурай сваёй слабой (А. Вярцінскі);
3. Ніхто цябе так не шкадуе і не любіць, як маці (С. Грахоўскі);
4. Слова! Яно неабсяжнае, як сусвет (У. Юрэвіч);
5. Чым вякам ты пахвалішся, у вяках чым праславішся, час маторны і мутарны, электронны, камп’ютарны (А. Грачанікаў);
6. Нашто, скажы мне, ты жывеш і з думкамі якімі? (А. Гарун).

Работы ўдзельнікаў былі самыя разнастайныя па жанрах і стылістыцы. Чытаючы працы, асабліва тыя, дзе раскрываліся самыя патаемныя думкі, якія, можа, ніколі б і не выказаліся ўслых, выкладчыкі былі вельмі прыемна ўражаны глыбінёй думак маладога пакалення беларусаў.

Журы ацэньвала эсэ па наступных крытэрыях:

– арыгінальнасць тэксту;
– мастацкі падыход (жанравая адпаведнасць, збалансаванасць зместу і формы);
– граматнасць;
– вобразнасць;
– творчы падыход да праблематыкі.

Трэба адзначыць, што кожны раз больш за 400 студэнтаў спрабуе сябе ў творчым выяўленні сваіх думак. На ўзнагароджванні заўсёды прысутнічаюць дэкан факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі і прафесійнай арыентацыі, загадчык кафедры агульнаадукацыйных дысцыплін, выкладчыкі.

Такім чынам, фарміраванне светапогляду навучэнцаў праз творчую дзейнасць у рамках дысцыпліны “Беларуская мова (культура маўлення)” з’яўляецца ўнікальнай магчымасцю як для выкладчыка-прадметніка, так і для студэнта павысіць эфектыўнасць і якасць адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Кодекс Республики Беларусь об образовании. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.pravo.by/document/?guid=3871&p0=hk1100243 .– Дата доступу: 11.04.2021.*

*2. Львов, М. Р. Словарь - справочник по методике русского языка: Учеб. пособие для студентов пед. ин-тов по спец. «Рус. яз. и лит.» / М.Р. Львов.– М.: Просвещение, 1988. – 240 с.*